Теория

# МЕТАДЫ СУЧАСНАГА ХРАМАБУДАЎНІЦТВА: ВЫЯЎЛЕННЕ ЭТАЛОННЫХ ХАРАКТАРЫСТЫК ПРАВАСЛАЎНАЙ АРХІТЭКТУРЫ



Віталь Арабей

У працэсе фарміравання архітэктуры сучасных праваслаўных храмаў, узаемадзеяння іх з архітэктурным асяроддзем і прыродным ландшафтам значнае месца належыць метадам храмабудаўніцтва, сярод якіх вылучаюцца імітацыя, эклектыка, стылізацыя, імправізацыя, наватарства. Адсутнасць прынцыпаў іх выкарыстання сталася прычынай узнікнення шэрагу праблемаў на ўсіх узроўнях – горадабудаўнічым, архітэктурна-планіровачным, архітэктурна-мастацкім, вобразна-стылістычным. У сувязі з гэтым актуальным з'яўляецца аналіз станоўчых і адмоўных якасцяў існых рашэнняў з мэтай стварэння абгрунтаваных прынцыпаў выкарыстоўвання кожнага метаду.

Дамінуючай якасцю метаду **імітацыі** выступае падобнасць да архітэктуры пэўнага перыяду, розныя ўзроўні паўтору яго архітэктурна-мастацкіх рашэнняў, але без глыбіннай абумоўленасці культурнымі, сацыяльнымі, тэхналагічнымі і іншымі першапрычынамі. У значнай ступені такі падыход з'яўляецца фальсіфікацыяй, ігнараваннем унікальных якасцяў нашага часу, што ў выпадку культавай архітэктуры, якая павінна быць максімальна праўдзівай, непрымальна. Асабліва ярка архітэктурна-мастацкі і стылістычны антаганізм выяўляецца на горадабудаўнічым узроўні, калі архітэктура праваслаўных храмаў, несумаштабная, стылістычна іншародная, «выпадае» з кантэксту сучаснай забудовы (мал. 1). На архітэктурна-планіровачным узроўні дысгармонія выяўляецца ў спалучэнні планіровачных і аб'ёмна-прасторавых рашэнняў мінулага з вялікай наменклатурай памяшканняў, якія актыўна выкарыстоўваюцца ў сучасных прыходскіх храмах. Часткова гэтыя памяшканні раней былі асобнымі будынкамі, а цяпер увайшлі ў склад храма, часткова – новыя па сваёй функцыі. Цытаванне вобразна-стылістычных рашэнняў мінулага, што адбываецца пры метадзе імітацыі, пазбаўляе царкоўную архітэктуру жыццёвай энергіі – а яна праяўляецца толькі ў пастаянным творчым працэсе і павінна быць сугучнай мастацкім пошукам кожнага гістарычнага перыяду: «Уся гісторыя хрысціянскага мастацтва паказвае, што евангельскі ідэал можа існаваць у любой форме» [10]. Выключэннем, калі метад імітацыі абгрунтаваны, можна лічыць сітуацыю ўключэння праваслаўнага храма ў архітэктурна-цэласны асяродак, дзе іншая стылістыка выклікала б дысананс. Ва ўмовах сучаснай Беларусі гэты метад выкарыстоўваецца дастаткова абмежавана, што, з аднаго боку, тлумачыцца неабходнасцю кваліфікаваных архітэктараў і будаўнікоў для рэалізацыі праектаў такога кшталту, з другога – дастаткова вялікімі выдаткамі на ўвасабленне складаных архітэктурна-мастацкіх рашэнняў.

Параўнальна з вышэйразгледжаным метад **эклектыкі** выяўляе больш высокі ўзровень творчасці. Тут адбываецца кампіляцыя вобразных рашэнняў розных перыядаў храмабудаўніцтва (мал. 2). Часам у выніку творчага сінтэзу разнастылістычных падыходаў ствараюцца адмысловыя, высакаякасныя творы, але ў асноўнай масе эклектычнасць культавага дойлідства характарызуецца наборам элементаў, не злучаных агульнай архітэктурнай ідэяй, і, як правіла, невысокай эстэтычнай вартасці (мал. 3). Аргументамі абмежаванага выкарыстання метаду эклектыкі ў храмабудаўніцтве можна лічыць яго пэўную фальсіфікацыйнасць, як пры імітацыі, і ўнутраную супярэчлівасць, што праяўляецца ў спробе стварэння новых вобразаў архітэктурна-мастацкімі сродкамі мінулых перыядаў. Верагодна, адным з найлепшых варыянтаў метаду эклектыкі можа стаць фарміраванне своеасаблівай пераходнай зоны паміж забудовай розных

Репозиторий БНТУ

перыядаў, у якой будуць спалучацца якасці суседніх стыляў. Пры дапамозе названага прыёму можна максімальна арганічна злучыць рознахарактарную тканіну паселішча. На функцыянальна-планіровачным узроўні эклектыка раскрывае больш шырокі ў параўнанні з метадам імітацыі спектр рашэнняў, якія ў большай ступені адпавядаюць патрабаванням сучаснага прыходскага жыцця, але, нягледзячы на гэта, застаецца праблема «ўпісвання» функцый у вызначаныя старадаўняй архітэктурай планіровачныя схемы. Вобразна-стылістычны ўзровень характарызуецца замкнёнасцю на архітэктурна-мастацкіх падыходах мінулага, не дае культавай архітэктуры магчымасці паўнавартасна развівацца, хаця і прапануе пэўную варыятыўнасць рашэнняў. У адрозненне ад імітацыі метад эклектыкі атрымаў максімальнае распаўсюджанне ў беларускай прыходскай архітэктуры дзякуючы сваёй эстэтычнай непатрабавальнасці, магчымасці рэалізацыі як прафесійнымі архітэктарамі і будаўнікамі, так і ўласнымі сіламі прыходаў.



Мал. 2. Свята-Мікалаеўская царква ў аграгарадку Лучнікі, Слуцкі р-н



Мал. 1. Свята-Троіцкая царква ў п. Бараўляны, Мінскі р-н



Мал. 3. Храм у гонар абраза Божай Маці «Ціхвінскі» ў Брэсце

Метад **стылізацыі** ў пэўнай ступені з'яўляецца кампрамісам, дзе архітэктура папярэдніх перыядаў атрымлівае сучаснае гучанне дзякуючы новым сродкам архітэктурна-мастацкай выразнасці (мал. 4). Вобразнае ўвасабленне знаходзяць эстэтычныя прыярытэты, характэрныя для дадзенага часу, што надае актуальнасць сучаснаму храмабудаўніцтву, захоўваючы шчыльную знітаванасць з традыцыямі храмабудавання. Адмоўныя якасці метаду – абмежаванасць архітэктурных першаўзораў, якія прымаюцца за аснову; элемент «умоўнасці і гульні», на якім будуецца стылізатарства. На горадабудаўнічым узроўні метад стылізацыі можа дастаткова гарманічна спа-



Мал. 4. Свята-Міхайлаўская царква ў п. Касцюкоўка, Гомельскі р-н

лучацца з большай часткай старадаўняй і сучаснай архітэктуры, што раскрывае шырокія перспектывы па яго выкарыстанні. Планіровачныя абмежаванні, характэрныя для імітацыі і эклектыкі, маюць значна меншыя маштабы. Высокія патрабаванні да прафесійнага ўзроўню архітэктараў, неабходнага для стылізацыі, абумовілі невялікае распаўсюджанне метаду ў сучасным беларускім храмабудаўніцтве.

Метад **імправізацыі** – якасна новы ўзровень праваслаўнага храмабудаўніцтва, у якім творчы акцэнт змяшчаецца з гістарычнай абумоўленасці царкоўнага дойлідства на сучасныя прынцыпы формаўтварэння і мастацкага аздаблення культавай архітэктуры. Пры захаванні генетычнай сувязі з храмабудаўніцтвам мінулага, яе пераемнасці развіваецца сучасная «мова» сакральнага мастацтва, у якой ствараюцца максімальна спрыяльныя ўмовы для фарміравання самабытнага і гарманічнага вобраза (мал. 5). Храмы, узведзеныя паводле метаду імправізацыі, гарманічна спалучаюцца з сучаснай і змяшанай забудовай, могуць выкарыстоўвацца ў якасці горадабудаўнічых дамінантаў і акцэнтаў. Пры адначасовым будаўніцтве з аб'ектамі грамадскага і жылога прызначэння магчыма стварэнне горадабудаўнічых ансамбляў. Адсутнасць жорсткіх патрабаванняў адпаведнасці пэўнай стылістыцы з характэрнымі планіровачнымі рашэннямі дазваляе свабодна рэалізоўваць неабходныя функцыянальна-планіровачныя схемы канкрэтнага прыхода, якія могуць спрыяць стварэнню адмысловых аб'ёмна-прасторавых кампазіцый. Метад імправізацыі садзейнічае рэалізацыі шырокага спектру архітэктурна-мастацкіх рашэнняў у дыяпазоне ад стылізацыі да наватарства, дзе архітэктар у значнай ступені раскрывае свой патэнцыял сутворцы Бога [4].

Агульнае, што аб'ядноўвае разгледжаныя метады, – знітаванасць з праваслаўным дойлідствам мінулага. У прынцыпе гэта вельмі станоўчая якасць, праз якую, грунтуючыся на папярэднім вопыце, ствараюцца найбольш дасканалыя архітэктурныя аб'екты. Аднак спецыфіка сучаснай беларускай праваслаўнай архітэктуры ў тым, што ў якасці правобразаў вельмі часта выступаюць храмы іншай краіны – Расіі. Такім чынам ігнаруецца нацыянальная і рэгіянальная ўнікальнасць праваслаўнага храмабудаўніцтва Беларусі.



Мал. 5. Храм у гонар Святых Жонак-Міраносіц у Баранавічах



Мал. 6. Комплекс прыхода ў гонар Раства Хрыстова ў Салігорску

Метад **наватарства** характарызуецца пошукам і эксперыментатарствам на ўсіх узроўнях праваслаўнага храмабудаўніцтва: горадабудаўнічым, архітэктурна-планіровачным, архітэктурна-мастацкім, стылістычным і вобразным. Параўнальна з імправізацыяй – найбольш творчым з усіх разгледжаных метадаў – наватарства ідзе шляхам вынаходніцтва ўласных рашэнняў і ў мінімальнай ступені карыстаецца вопытам папярэдніх этапаў. У горадабудаўніцтве гэта выявілася стварэннем адзінай прасторавай кампазіцыі з разнастайных аб'ектаў комплексу, якая мае складаную, шматпланавую пабудову і выразную геаметрычную аснову (мал. 6). Метад наватарства гарманічна ўзаемадзейнічае з архітэктурным атачэннем XX–XXI стст. Асобныя патрабаванні заказчыка па функцыянальнай арганізацыі храма могуць спрыяць фарміраванню адмысловых планіровачных і аб'ёмна-прасторавых рашэнняў. Трэба адзначыць, пры метадзе наватарства найбольш актыўна выкарыстоўваюцца сродкі мадэрнісцкай і постмадэрнісцкай архітэктуры (мал. 7), уласцівыя сучаснаму дойлідству, што часам прыводзіць да страты характэрных рысаў сакральнага будынка. Да аналагічных вынікаў вядзе стварэнне арыгінальных архітэктурна-мастацкіх рашэнняў, якое з'яўляецца самамэтай, заснаванай на жаданні самавыяўлення архітэктара, а не на пошуку новых вобразаў сучасных храмаў. Першачарговае значэнне ў хрысціянскім мастацтве мае сакральны складнік, багаслоўская абгрунтаванасць вобразных рашэн-

Репозиторий БНТУ



Мал. 7. Свята-Раства-Багародзіцкая царква ў Салігорску

няў, і толькі пасля ідзе эстэтычны, утылітарны і ўнікальны – менавіта такой іерархіі каштоўнасцяў павінен прытрымлівацца архітэктар пры праектаванні праваслаўных храмаў.

Арыентацыя на першаўзор, уласцівая метадам імітацыі, эклектыкі, стылізацыі і імправізацыі, выступае своеасаблівай гарантыяй адпаведнасці кананічнай традыцыі праваслаўнай царквы. Пры метадзе наватарства адбываецца самастойнае фарміраванне вобраза храма, якое патрабуе ад архітэктара валодання базавымі багаслоўскімі ведамі, неабходнымі пры стварэнні культавага аб'екта. Важным, а па меркаванні асобных прадстаўнікоў праваслаўнага кліру, абавязковым з'яўляецца прыналежнасць дойліда да Царквы і яго актыўная духоўная практыка. Гэта ў значнай ступені спрыяе разуменню глыбінных, характэрных для пэўнай канфесіі адметнасцяў, якія павінны ўвасабляцца ў архітэктуры храмаў. Натуральна, што цалкам абумоўліваць узровень культавай архітэктуры духоўным станам архітэктара немагчыма, але і ігнараваць дадзены фактар было б памылкай.

Падчас даследавання было выяўлена, што архітэктарамі амаль заўсёды выкарыстоўваюцца адзін-два сумежныя метады храмабудаўніцтва незалежна ад якасцяў архітэктурнага асяроддзя, у якім узводзіцца культавы аб'ект. Такая пазіцыя ў шэрагу выпадкаў вядзе да страты гарманічных адносінаў паміж аб'ектамі як самога праваслаўнага комплексу пры праектаванні рознымі архітэктарамі, так і яго вобразнага ўзаемадзеяння з навакольнай архітэктурай.

Выяўленне **эталонных характарыстык** абумоўлена запатрабаванасцю існавання іерархіі базавых складнікаў архітэктуры прыходскіх храмаў, паводле якіх адбываецца яе фарміраванне і адпаведнасць якім вызначае ўзровень горадабудаўнічых, архітэктурна-планіровачных, архітэктурна-мастацкіх, вобразна-стылістычных рашэнняў сучаснага праваслаўнага храмабудаўніцтва.

Праваслаўны храм у формах, якія склаліся гістарычна, у першую чаргу азначае Царства Боскае ў адзінстве трох яго абласцей: Боскага, нябеснага і зямнога [8, с. 26]. У першым храме – скініі – раскрываюцца сакральны, эстэтычны і ўтылітарны складнікі яе ўладкавання [1, с. 110–114]. Прынцыпы арганізацыі скініі ў далейшым былі ўвасоблены ў іерусалімскіх, а потым і шматлікіх хрысціянскіх храмах, гэтыя складнікі можна разглядаць як асноўныя і на сучасным этапе храмабудаўніцтва. Дадатковым складнікам, што заўсёды прысутнічае ва ўсіх творах Бога, з'яўляецца ўнікальнасць. Наяўнасць усіх 4 складнікаў і іх гарманічнае спалучэнне вызначае ўзровень царкоўнага дойлідства.

**Горадабудаўнічае рашэнне:**

– *сакральны складнік*. Нягледзячы на свецкі характар беларускай дзяржавы, лагічным выглядае стварэнне сістэмы сакральных прастораў паселішчаў [3], якая б увасабляла сабой духоўнае адраджэнне краіны, 58,9% грамадзян якой вераць у Бога [5, с. 730]. Важную ролю ў гэтым працэсе адыгрывае праваслаўная царква, што пацверджана прызнаннем яе адмысловай гістарычнай ролі [9], шматлікімі праграмамі супрацоўніцтва з дзяржавай, колькасным дамінаваннем сярод разнастайных веравызнанняў, дзе 81,7% вернікаў адносяць сябе да праваслаўнай традыцыі [5, с. 730]. Гэта можна разглядаць як аргумент на карысць актыўнага выкарыстоўвання праваслаўнай архітэктуры пры фарміраванні вобразаў паселішчаў;

– *эстэтычны складнік*. Параўнальна з будынкамі іншых тыпаў хрысціянскія храмы маюць шэраг вобразных, архітэктурных і мастацкіх адметнасцяў. Мэтазгодна выкарыстоўваць гэтыя якасці пры фарміраванні горадабудаўнічазначных кампазіцый паселішчаў, дзе культавым будынкам будзе адводзіцца роля дамінантаў і акцэнтаў, яны будуць утвараць сістэму візуальных арыенціраў для фарміравання выразнага сілуэта;

– *утылітарны складнік*. Культавыя аб'екты як важныя грамадскія ўстановы павінны арганічна ўключацца ў структуру горада і забяспечваць камфортныя ўмовы карыстання імі. Аптымальным рашэннем для прыходскіх храмаў з'яўляецца непасрэдная блізкасць да жылой забудовы, дзе пешаходная дасягальнасць не будзе перавышаць 15 хвілінаў для гарадскіх і 30 – для сельскіх паселішчаў [6, с. 24];

– *унікальны складнік*. Асаблівасць Беларусі – яе шматканфесійнасць, якая ў мінулым увасаблялася ў стварэнні горадабудаўнічых ансамбляў з гарманічным спалучэннем храмаў розных веравызнанняў, важнай з'яўляецца пераемнасць дадзенай традыцыі ў сучаснай культавай архітэктуры.

Репозиторий БНТУ

**Архітэктурна-планіровачнае рашэнне:**

– *сакральны складнік.* Паводле сімволікі мінімальная колькасць планіровачных элементаў праваслаўнага храма – два, дзе першы атаясамліваецца з раем (алтар), а другі – з апраўданаю зямлёю (малітоўная зала). Дадатковы трэці сімвалізуе зямлю (бабінец) [8, с. 24]. Геаметрычныя фігуры, паводле якіх ствараюцца планіровачныя рашэнні храмаў, утрымліваюць разнастайныя багаслоўскія трактоўкі (квадрат – апраўданая зямля, круг – вечнасць існавання царквы і інш.). Часта ў якасці асновы выкарыстоўваліся хрысціянскія сімвалы (крыж, віфліемская зорка і інш.). Асаблівасцю праваслаўнага храмабудаўніцтва з'яўляецца арыентацыя алтарнай часткі на ўсход [8, с. 21].

– *эстэтычны складнік.* На базе вышэйразгледжаных фігур і сімвалаў могуць ствараццa планіровачныя рашэнні высокай архітэктурна-мастацкай выразнасці, якія ў далейшым развіваюцца ў шматпланавыя аб'ёмна-прасторавыя кампазіцыі.

– *утылітарны складнік.* Асновай прыходскага храма з'яўляецца богаслужбовая функцыя, якая ў планіроўцы прадстаўлена дзвюма абавязковымі зонамі (алтар і малітоўная зала). Дапаўненне бабінцам (гандлёвая функцыя), хорамі (богаслужбовая функцыя), рызніцай і панамаркай (службова-бытавая функцыя) забяспечвае камфортныя ўмовы правядзення набажэнстваў. Для паўнавартаснага прыходскага жыцця патрабуюцца памяшканне прычту, кабінет настаяцеля, страўня, клас нядзельнай школы.

– *унікальны складнік.* Планіровачныя рашэнні прыходскага храмабудаўніцтва Беларусі, як правіла, мелі дакладную функцыянальную абумоўленасць і максімальна рацыянальнае выкарыстоўванне прасторы храма.

**Архітэктурна-мастацкае рашэнне. Вобразна-стылістычныя падыходы:**

– *сакральны складнік.* Першачарговае значэнне ў праваслаўным храмабудаўніцтве мае багаслоўская абумоўленасць вобразных і архітэктурна-мастацкіх рашэнняў, якая дасягаецца пры дапамозе шырокага спектру знакаў і сімвалаў. Вобраз хрысціянскага храма як часткі фенаменальнага свету – ізаморфная выява трансцэндэнтнай першарэальнасці. У ім адбываецца матэрыялізацыя не толькі духоўнага значэння, але і самога знешняга падабенства з Боскімі і нябеснымі прадметамі [8, с. 15].

– *эстэтычны складнік.* Адлюстраванне ў архітэктуры храма нябеснай дасканаласці і гармоніі, што дасягаецца максімальна выразнымі сродкамі аб'ёмна-прасторавых, архітэктурна-кампазіцыйных і архітэктурна-мастацкіх рашэнняў.

– *утылітарны складнік.* Характэрнымі якасцямі архітэктурна-мастацкіх рашэнняў праваслаўных храмаў Беларусі выступаюць, як правіла, рацыяналістычнасць і тэктанічная абумоўленасць.

– *унікальны складнік.* Сярод розных перыядаў развіцця беларускай праваслаўнай архітэктуры асаблівай увагі заслугоўвае перыяд ВКЛ і Рэчы Паспалітай [7, с. 5; 2, с. 374], калі былі створаныя найбольш самабытныя вобразныя і архітэктурна-мастацкія рашэнні. Адмысловую трактоўку хрысціянскага мастацтва, у якой максімальна красамоўна адлюстраваўся нацыянальны характар і геній мясцовых майстроў [11, с. 82], мае народнае дойлідства Беларусі.

**Высновы.** Грунтуючыся на аналізе разнастайных метадаў храмабудаўніцтва (1991–2013 гг.), выяўленых станоўчых і адмоўных якасцях узаемадзеяння іх з навакольным асяродкам, прапануюцца наступныя прынцыпы іх выкарыстання:

- **імітацыя:** уключэнне храма ў архітэктурна-цэласны асяродак, размяшчэнне на ўнікальных тэрыторыях;
- **эклектыка:** фарміраванне пераходнай зоны паміж забудовай розных перыядаў, дзе спалучаюцца характэрныя якасці суседніх стыляў; размяшчэнне на ўнікальных і прывабных тэрыторыях;
- **стылізацыя:** спалучэнне храма з забудовай розных перыядаў, як старадаўняй, так і сучаснай; размяшчэнне на прывабных тэрыторыях;
- **імправізацыя:** арганічны ўваход храма ў забудову XX–XXI ст.; размяшчэнне на прывабных і нейтральных тэрыторыях;
- **наватарства:** максімальна-гарманічнае ўзаемадзеянне з архітэктурным атачэннем XX–XXI ст.; размяшчэнне на прывабных, нейтральных і хаатычных тэрыторыях.

Прымаючы за аснову Свяшчэннае Пісанне, былі выяўлены эталонныя характарыстыкі архітэктуры прыходскіх храмаў: сакральнасць, эстэтычнасць, утылітарнасць, унікальнасць, паводле якіх адбываецца яе фарміраванне і адпаведнасць якім вызначае ўзровень горадабудаўнічых, архітэктурна-планіровачных, архітэктурна-мастацкіх, вобразна-стылістычных рашэнняў сучаснага праваслаўнага храмабудаўніцтва.

**Літаратура**

1. Біблія: Кн. Святога пісання Старога і Новага Запавету: Кананічныя: У беларус. пер. / пер. В. Сёмуха. – Duncanville (USA): World Wide Printing, 2002. – 1534 с.
2. Габрусь, Т.В. Мураваная сакральная архітэктура XVI–XVIII стст. / Т.В. Габрусь // Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславян. і еўрап. кантэксце. У 4 т. Т. 2. XV – сярэдзіна XVIII стст. / А.І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мн., 2006. – Гл. 2. – С. 136–391.
3. Иодо, И.А. Городские пространства сакрального типа / И.А. Иодо, Ю.А. Протасова // Градостоительство и архитектура: актуальные проблемы: сб. научн. тр. / Бел. нац. технич. ун-т; архитектурный факультет; под ред. Г.В. Полянской – Мн.: Тэхналогія, 2002. – С. 50–55.
4. Камышанов, К. Кирпич в здании Вечности / К. Камышанов // Православие и мир. Ежедневное интернет-СМИ [Электронный ресурс]. – 2010. – Режим доступа: http://www.pravmir.ru/nash-kirpich-v-zdanii-vechnosti/. – Дата доступа: 17.10.2012.
5. Кто живет в Беларуси / А.Вл. Гурко [и др.]; Нац. акад. наук Беларуси. Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы. – Мн.: Беларус. навука, 2012. – 799 с.
6. Культовые здания и сооружения. Здания, сооружения и комплексы православных храмов. Правила проектирования = Культавыя будынкі і збудаванні. Будынкі, збудаванні і комплексы праваслаўных храмаў. Правілы праектавання: ТКП 45–3.02–83–2007. – Введ. 01.04.08. – Мн.: РУП «Стройтехнорм», 2008. – 44 с.
7. Кушнярэвіч, А.М. Культавае дойлідства Беларусі XIII – XVI стст.: Гіст. і архіт.-археал. даследаванне / А.М. Кушнярэвіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 152 с.
8. Настольная книга священнослужителя / По благословению Святейшего Патриарха Московского и всея Руси Пимена. – М.: Изд. Моск. Патриархии, 1983. – Т. 4. – 824 с.
9. О свободе совести и религиозных организациях: Закон Респ. Беларусь, 17 декабря 1992 г., № 2054-XII: в ред. Законов Респ. Беларусь от 22.12.2011 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Мн., 2013.
10. Щукин, Т. Архитектура должна быть новой / А. Егоров, Т. Щукин // Вода живая. Официальное издание Санкт-Петербургской епархии Русской Православной Церкви [Электронный ресурс]. – 1993. – Режим доступа: http://aquaviva.ru/archive/2010/12/821.html. – Дата доступа: 10.02.2011.
11. Якімовіч, Ю.А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVII – XIX стст. / Ю.А. Якімовіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1978. – 152 с.

Репозиторий БНТУ